дзел Т-ва, прыступіўшы да другога году сваёй працы, шырока разьвярнуў сваю дзейнасьць. Да гэтага часу наладжаны вечарыны: 8-га сьнежня 1929 году ў Дзьвінску і 9-га сьнежня ў Грыве. Абодва спэктаклі-вечарыны выклікалі шырокую зацікаўленасьць беларускага грамадзянства” [2, с. 3]. Найбольшай папулярнасцю гледачоў карысталіся п’есы Я. Купалы, Ф. Аляхновіча, В. Дуніна-Марцінкевіча.

Палітыка развіцця культурна-нацыянальных аўтаномій спрыяла актыўнай рабоце беларускай супольнасці. Аднак дзяржаўны пераварот 1934 г., які прывёў да ўлады К. Улманіса, абмежаваў грамадскае і культурнае развіццё нацыянальных меншасцей. Манаполія на ўладу прэзідэнта міністраў К. Улманіса спыніла дэмакратычныя тэндэнцыі развіцця латышскай дзяржаўнасці. Пасля перавароту ўлады пачалі масава зачыняць грамадскія арганізацыі, перыядычныя выданні і школы нацыянальных меншасцей, што стала прычынай ліквідацыі асноўнай часткі беларускіх арганізацый, газет і часопісаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Екабсонс Э. Культурная деятельность белорусов Латвии в 1918–1940 годах // Латвія – Беларусь: дыялог двух культур: матэрыялы І навук.-практ. канф., Рыга, 4 снежня 2004 г. Рыга: Саюз беларусаў Латвіі, 2005. С. 76–90.

2. А. Б. Праца Беларускага Тэатральнага Т-ва // Сялянская ніва. – № 1 (188). – 1929. – С. 3.

УДК 94(476)

І. А. Андарала, канд. пед. навук, дац.
(БДТУ, г. Мінск)

## АДНАЎЛЕННЕ СЕТКІ ШКОЛ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШЫ ПАСЛЯВАЕННЫ ВУЧЭБНЫ ГОД

Аналіз гістарыяграфічных крыніц сведчыць, што стан школьнай адукацыі рэспублікі ў першы пасляваенны год знайшоў пэўнае асвятленне ў дысертацыйных даследаваннях навукоўцаў савецкага перыяду, якія апісвалі поспехі БССР у культурнай рэвалюцыі, дасягнутыя пад кіраўніцтвам КПСС. Для доказу поспехаў імі, як правіла, прыводзіліся лічбы, якія сведчылі аб хуткім росце сеткі школ і навучэнцаў у іх. У той жа час пытанні стану вучэбна-метадычнай гаспадаркі школ, будаўніцтва і рамонту школьных будынкаў і памяшканняў, выканання закону аб усянавучы, якія выключна востра стаялі і вельмі складана ра-

шаліся ў першы пасляваенны год, не атрымалі аб'ектыўнага адлюстравання. Агляд гісторыі айчыннай агульнаадукацыйнай школы з сучасных пазіцый дазваляе асэнсаваць і паказаць працэс яе пасляваеннага аднаўлення па-іншаму. Падкрэслім: не лепш або горш, а па-іншаму, у параўнанні з тым, як гэта рабілася ў савецкі перыяд.

Поспехі ў пасляваенным аднаўленні і далейшым развіцці народнай гаспадаркі Беларусі на новай тэхнічнай аснове ў вялікай ступені залежалі ад прыходу ў эканоміку значнай колькасці маладых людзей, валодаючых глыбокімі ведамі асноў навук, здольных асвойваць тэхналогіі высокамеханізаванай вытворчасці і прадуктыўна працаваць у розных яе галінах. Падрыхтоўка такіх спецыялістаў магла быць забяспечана толькі пры ўмове эфектыўнай дзейнасці агульнаадукацыйнай сістэмы рэспублікі. Менавіта таму СНК СССР і ЦК ВКП(б) сваёй сакрэтнай пастановай "Аб бліжэйшых задачах СаўнаркомаБССР і ЦК КП(б)Б, прынятай яшчэ 1 студзеня 1944 г., абавязаў партыйна-савецкае кіраўніцтва рэспублікіаднавіць дзейнасць агульнаадукацыйных школ на вызваленай ад захопнікаў тэрыторыі [1, с.37].

Як вынікае з сакрэтнай пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б № 1163-292с "Аб мерапрыемствах па падрыхтоўцы школ да 1945/46 навучальнага года", прынятай 22 жніўня 1945 года, нягледзячы на ўсе намаганні партыйна-дзяржаўных структур, абласных, раённых аддзелаў народнай адукацыі, удзел шырокіх слаёў грамадскасці, вырашыць усе задачы, пастаўленыя партыйна-савецкім кіраўніцтвам краіны па аднаўленні школьнай адукацыі Беларусі да пераможнага завяршэння Вялікай Айчыннай вайны, так і не атрымалася [2, л. 157–160].

Пераход да мірнага жыцця дазволіў рэспубліцы прадоўжыць аднаўленне разбуранай у гады вайны і акупацыі агульнаадукацыйнай школы. Як і раней, асноўнымі задачамі з'яўляліся: рамонт і будаўніцтва новых школ, развіццё сеткі школ і ўмацаванне іх вучэбна-матэрыяльнай базы, выкананне ўсянавуча.

Трэба адзначыць, што ўжо ў летнія месяцы 1945 года мясцовыя органы ўлады і народнай адукацыі здолелі правесці значную работу па падрыхтоўцы школьнай адукацыі рэспублікі да пачатку першага пасляваеннага вучэбнага года.

Як адзначалася ў пастанове калегіі Народнага Камісарыята асветы рэспублікі "Аб выніках работы школ і органаў народнай асветы за першае паўгоддзе 1945/46 вучэбнага года і задачах на другое паўгоддзе", прынятай 26 лютага 1946 года, да 1 верасня 1945 года была перагледжана, упарадкавана і значна пашырана сетка школ, праведзена

пэўная работа па рамонце і абсталяванні школьных будынкаў і памяшканняў, павелічэнні фонду школьных падручнікаў, вучэбна-наглядных дапаможнікаў і пісьмовых прылад [3, л. 30].

На жаль, агульныя фразы пастановы "перагледжана", "значна пашырана", "праведзена пэўная работа" не адлюстроўвалі сапраўдны стан школьнай адукацыі рэспублікі на пачатак 1945/46 вучэбнага года. Як вынікала з прынятага дакумента, найбольш істотныя поспехі пры падрыхтоўцы школьнай адукацыі рэспублікі да пачатку першага пасляваеннага вучэбнага года былі дасягнуты ў пашырэнні сеткі школ, павелічэнні кантынгенту навучэнцаў у іх, асабліва ў сямігадовых і сярэдніх школах.

Сапраўды, колькасць агульнаадукацыйных школ у рэспубліцы на пачатак 1945/46 вучэбнага года ў параўнанні з папярэднім вучэбным годам павялічылася з 10 251 да 10 965, або на 714 школ (на 7 %), у тым ліку: пачатковых – з 8 470 да 9 001 (на 531, або 6,3 %), сямігадовых – з 1 518 да 1 640 (на 122, або на 8 %) і сярэдніх – з 263 да 324 (на 61, або на 23%) [3, л. 50]. Аднак неабходна адзначыць, што план пашырэння сеткі школ, даведзены рэспубліцы сакрэтнай пастановай СНК СССР № 400-120с ад 25 сакавіка 1945 г. "Аб дзяржаўным плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі на 1945 г.", аказаўся выкананым толькі ў частцы агульнай колькасці школьных вучэбных устаноў, прычым за кошт адкрыцця звышпланавай колькасці пачатковых школ. Што тычыцца сямігодак, то, у адпаведнасці з адзначаным дзяржаўным планам, неабходна было стварыць 1 990 такіх школ, а было адкрыта толькі 1 640. Сетку сярэдніх школ рэспублікі планавалася давесці да 350, а было адкрыта 324 школы [4, л. 15]. Такім чынам, дзяржаўны план па адкрыцці ў рэспубліцы да пачатку 1945/46 вучэбнага года колькасці сямігадовых і сярэдніх школ аказаўся істотна недавыкананы. Гэта можна патлумачыць тым, што раённыя аддзелы народнай адукацыі, вымушаныя выконваць даведзеныя колькасныя паказчыкі па адкрыцці новых школ, аддавалі перавагу пачатковым, якія было зручней ствараць. Пры гэтым не заўсёды ўлічвалася прыдатнасць памяшканняў для размяшчэння школ і наяўнасць настаўнікаў для работы ў іх. Што да выканання планавых заданняў па адкрыцці новых сямігадовых і сярэдніх школ, то ў многіх раёнах да гэтага падыходзілі фармальна, без уліку іх рэальнай неабходнасці. У выніку, часта сямігодкі знаходзіліся ў блізкай адлегласці адна ад другой пры напаўняльнасці класаў у іх толькі па 5–11 чалавек [3, л. 51].

Кантынгент навучэнцаў, якія наведвалі ўсе тыпы агульнаадукацыйнай школы рэспублікі ў 1945/46 вучэбным годзе, у параўнанні з папярэднім вучэбным годам павялічыўся з 1 052 735 да 1 328 819, або

на 276 084 чалавекі (на 26,2 %), у тым ліку: у 1–4 класах – з 936 163 да 1 145 634 чалавек (на 209 466 чалавек, або на 22,3 %), у 5–7 класах – з 108 044 да 165 825 чалавек (на 77 781 чалавек, або на 72 %) і ў 8–10 класах – з 8 523 да 17 360 чалавек (на 8837 чалавек, або на 103 %). [3, л. 50]. Зноў трэба падкрэсліць, што ўстаноўлены раней адзначанай сакрэтнай пастановай СНК СССР [4] план па вучнёўскім кантынгенце адукацыйная сістэма рэспублікі ў цэлым выканала і нават крыху перавыканала. Як і ўвыпадку з сеткай школ, гэта ўдалося вырашыць за кошт колькасці навучэнцаў 1–4 класаў. Планы ж па колькасці навучэнцаў у 5–7 і 8–10 класах аказаліся істотна недавыкананымі. У 5–7 класах павінна было вучыцца 205 000 чалавек, а на 1 верасня 1945 г. села за парты толькі 165 825 (менш на 39 175 чалавек, або на 20 %). У 8–10 класы планавалася прыняць 22 000 вучняў, а да вучобы прыступіла толькі 17 360 чалавек, што склала 78,5 % ад плана [4, л. 15]. Галоўнай прычынай невыканання планавых паказчыкаў, як вынікае з архіўных дакументаў, з'яўлялася нездавальняючая работа мясцовых улад, органаў народнай адукацыі, школ па выкананні "сталінскага закону аб усянавучы". Па даных, прыведзеных НКА рэспублікі, у 1945/46 вучэбным годзе неахопленымі вучобай у школах засталося 85 000 дзяцей школьнага ўзросту. Праведзеная школьным аддзелам ЦК КП(б)Б праверка стану выканання закону аб усянавучы школамі рэспублікі выявіла, што даныя, прыведзеныя НКА, значна заніжаныя. Так, у Гродзенскай вобласці дзяцей школьнага ўзросту, неахопленых вучобай, аказалася не 3 097, а каля 13 000 [3, л. 51]. Такая нестыкоўка ў лічбах тлумачыцца тым, што дырэктары школ, загадчыкі райгарАНА утойвалі сапраўднае становішча з выкананнем закону аб усянавучы і падавалі справаздачы са значна заніжанымі лічбамі.

Такім чынам, нягледзячы на прынятыя кіруючымі органамі рэспублікі пастановы, дзейнасць структур асветы розных узроўняў, колькасць працуючых у 1945/46 вучэбным годзе агульнаадукацыйных школ як у цэлым, так і ў разрэзе пачатковых, сямігадовых, дзесяцігадовых, істотна ўступала іх колькасці ў 1940/41 вучэбным годзе. Таксама не атрымалася выйсці рэспубліцы на даваенны ўзровень і па кантынгенце навучэнцаў агульнаадукацыйных школ.

## ЛІТАРАТУРА

1. Освобожденная Беларусь. Документы и материалы : в 2 кн. / сост.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск, 2004. – Кн. 1. Сентябрь 1943 – декабрь 1944 / – 398 с.
2. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 6. Спр. 6.
3. НАРБ. – Ф. 4п, Воп. 17. Спр. 43.
4. НАРБ. – Ф. 42, Воп. 6. Спр. 5.